продвижения своих товаров они используют каталоги и буклеты, выполненные на высоком научно-методическом и полиграфическом уровнях в формате А4, что позволяет помещать фотографии, на которых четко видны габариты изделий. Информация, содержащаяся в этих изданиях в целом соответствует ожиданиям и требованиям покупателя.

ЛИТЕРАТУРА

1. http://www.psmedia.ru/articles/info_articles/ne_ukradi/

2. Иншакова, Н. Г. Рекламный текст: редакторский взгляд / Н. Г. Иншакова. — Москва: МедиаМир, 2007. — 288 с.

3. Аксенова, К. А. Реклама и рекламная деятельность: Конспект лекций / К. А. Аксенова. — Москва: Приориздат, 2005. — 96 с.

4. http://psylist.net/reklam/00023.htm

П. Дубовік, студэнт 6 курса ЗФ
(БДТУ, Минск)

## АСНОЎНЫЯ ТЫПАЛАГІЧНЫЯ ПРЫКМЕТЫ МОВАЗНАЎЧЫХ МАНАГРАФІЙ БЕЛАРУСІ XXI СТ.

Актуальнасць аналізу манаграфічных выданняў абумоўлена шэрагам прычын. Па-першае, вынікі яго дазволяць устанавіць ступень распрацаванасці тых ці іншых праблем беларускага мовазнаўства. Па-другое, акрэсліць кола аўтараў і патэнцыйных тытульных рэдактараў (рэцэнзентаў) навуковай і лінгвадыдактычнай літаратуры ў будучым, што немалаважна для арганізацыі вучэбнага і навуковага кнігавыдання Беларусі. Па-трэцяе, выявіць асноўныя тыпалагічныя прыкметы такіх выданняў.

Задача нашага даследавання — устанавіць асноўныя тыпалагічныя прыкметы лінгвістычных манаграфій, прысвечаных беларускай мове: месца выдання, тыраж, чытацкі адрас, праблематыка, фармат.

Матэрыялам для аналізу паслужылі 13 манаграфій, якія пабачылі свет у XXI ст. [Гл. спіс літаратуры].

**Месца выдання.** Пераважная большасць манаграфій (9) пабачыла свет у рэдакцыйна-выдавецкіх цэнтрах ВНУ. Лідарам тут з'яўляецца БДУ (4), затым ідуць МДУ імя А. А. Куляшова (2), УА «ВДУ імя П.М. Машэрава» (2), УА «ГДУ імя Ф. Скарыны» (1), ГрДУ імя Я.Купалы (1). У дзяржаўных выдавецтвах выдадзена 2 манаграфіі (праца Т. М. Аліферчык — «Беларуская навука»; Т. Р. Рамзы — «Вышэйшая школа»), у прыватных — 1 (даследаванне І. Р. Шкраб — ТАА "Асар").

Тыражы выданняў, за выключэннем манаграфіі І. Р. Шкрабы (300 экзэмпляраў), аднолькавыя — 100. Гэта ўстаялая тэндэнцыя выдання літаратуры такога тыпу.

Чытацкі адрас — навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі, аспіранты, магістранты і студэнты філалагічных спецыяльнасцей у адпаведнасці з навуковымі інтарэсамі.

**Праблематыка**. Тут заўважаецца пэўная заканамернасць, якая дазваляе ўстанавіць сферу навуковых інтарэсаў кожнай установы вышэйшай адукацыі. Манаграфіі, выдадзеныя ў БДУ, прысвечаны, як правіла, апісанню асаблівасцей станаўлення і развіцця сістэмы беларускай мовы: 1) станаўленне нормаў беларускай літаратурнай мовы ў галіне лексікі, графікі і арфаграфіі, анамастыкі XIX ст. [6]; 2) гісторыя беларускай лексікаграфіі і асаблівасці фіксацыі групы асабовых назоўнікаў у розных слоўніках XX ст. [9]; 3) працэсы фарміравання лексічнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы ў XIX – пачатку XX ст. [8]; 4) развіццё беларускай літаратурнай мовы 1920–1930-х гг. у яго сувязях *з* развіццём прэскрыптыўнага адгалінавання беларускай лінгвістыкі [10].

Тэматыка і праблематыка манаграфій, створаных ў МДУ імя А. А. Куляшова, — мова мастацкіх тэкстаў:

1) беларуская лінгвістычная паэтыка і лінгвістычная тэксталогія як самастойныя адгалінаванні беларускай філалогіі [2];

2) мова сучаснай беларускай мастацкай лігаратуры як асноўная функцыянальна-стылістычная разнавіднасць беларускай літаратурнай мовы [1].

У ВДУ імя П. М. Машэрава маюцца дзве living рознатэматычныя манаграфіі. Адна з іх прысвечана апісанню семантычнай структуры каларонімa, няўласным якасцям колеру і даследаванню колерапісу як сродку мастацкай вобразнасці і выразнасці ў мове твораў Якуба Коласа [4].

Другая — рэтраспектыўнаму, тэарэтыка-аналітычнаму і практыка-арыентаванаму аспектам лінгвametадычнай канцэпцыі вучэбнага тэксту [7].

Тэматыка і праблематыка астатніх манаграфій наступная:

– даследаванне айконімаў і гідронімаў Гомельшчыны на лексіка-семантычным і структурна-граматычным узроўнях [5];

– даследаванне заходнепалескага тапанімікона ў этналінгвістычным асвятленні [3];

– даследаванне тэрмінаў англійскага паходжання ў сучаснай беларускай мове, іх асіміляцыя да фанетычных, граматычных і семантычных нормаў мовы-рэцыпіента [11];

– даследаванне сучаснага стану спантаннага гарадскога маўлення пэўнай сацыяльнай групы інфармантаў-інтэлігентаў [12];

– даследаванне такой універсальнай з’явы, як варыянтнасць у сучаснай беларускай літаратурнай мове [13].

**Фармат** усіх кніг, выдадзеных у выдавецкіх цэнтрах устаноў вышэйшай адукацыі і дзяржаўных выдавецтваў традыцыйна аднолькавы 60 × 84 1/16. Адрозніваецца толькі манаграфія, падрыхтаваная прыватным выдаўцом [13]. Яе фармат — 60 × 90 1/16.

**Вывады**. Распрацоўка лінгвістычных праблем беларускай мовы актыўна вядзецца ў вядучых установах вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Аўтарамі манаграфій з’яўляюцца высокакласныя спецыялісты, якія

могуць выступаць рэцэнзентамі будучых навуковых публікацый: М. В. Абабурка, Ю. М. Бабіч — у галіне мовы мастацкіх твораў; Т. М. Аліферчык, Н. А. Багамольнікава — у галіне тапанімікі; Л. С. Васюковіч — у сферы рэдагавання вучэбнай літаратуры; А. В. Губкіна, І. А. Гапоненка, І. Р. Шкраба — у галіне лексікалогіі, лексікаграфіі; С. М. Запрудскі — у сферы графікі, арфаграфіі, сацыялінгвістыкі.

Сярод асноўных тыпалагічных рыс манаграфічных выданняў агульнымі для ўсіх выступаюць тыраж (як правіла 100 экзэмпляраў) і фармат (60 × 84 1/16).

Выдаўцамі такой літаратуры з’яўляюцца, як правіла, рэдакцыйна-выдавецкія арганізацыі ўстаноў вышэйшай адукацыі, паколькі асноўнымі спажыўцамі іх прадукцыі з’яўляюцца супрацоўнікі УВА і студэнты.

ЛИТЕРАТУРА

1. Абабурка, М. В. Мова сучаснай беларускай мастацкай літаратуры: манаграфія / М. В. Абабурка, Т. А. Казімірская, В. М. Саўчанка, Т. І. Тарасенка. — Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2005, — 248 с.

2. Абабурка, М. В. Беларуская лінгвістычная паэтыка і тэксталогія: манаграфія / М. В. Абабурка. — Магілёў: МДУ імя А. Куляшова, 2008. — 272, с.

3. Аліферчык, Т. М. Тапанімія Заходняга Палесся: этналінгвістычны аспект / Т. М. Аліферчык. — Мінск : Беларуская навука, 2013. — 255 с.

4. Бабіч, Ю. М. Колеравая і светлавая эстэтыка ў мове твораў Якуба Коласа: манаграфія / Ю.М. Бабіч. — Віцебск: Выдавецтва УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2002. — 127 с. (Тыраж 100 экз.)

5. Багамольнікава, Н. А. Тапанімія Гомельшчыны: структурна-семантычная характарыстыка: манаграфія / Н. А. Багамольнікава; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны", НДІ гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў. — Гомель: ГДУ, 2008. — 242 с.

6. Беларуская мова і мовазнаўства: XIX стагоддзе / пад агул. рэд. М.Р.Прыгодзіча. — Мінск: БДУ, 2013. — 147. (Тыраж 100 экз.)

7. Васюковіч, Л. С. Лінгваметадычная канцэпцыя вучэбнага тэксту: рэтраспектыўны, тэарэтыка-аналітычны і практыка-арыентаваны аспекты: манаграфія / Л. С. Васюковіч. — Віцебск : ВДУ, 2015. — 190.

8. Гапоненка І. А. Лексіка беларускай літаратурнай мовы XIX – XX ст. / І. А. Гапоненка. — Мінск: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2012. — 306.

9. Губкіна, А. В. Лексікалогія і лексікаграфія беларускай мовы XX ст.: сацыялінгвістычны аспект / А. В. Губкіна. — Мінск : Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2012. — 141.

10. Запрудскі, С. М. Беларускае мовазнаўства і развіццё беларускай літаратурнай мовы: 1920- 1930 гады / С. М. Запрудскі.-Мінск: БДУ, 2013. — 366 с.

11. Кавалёва, Л. Я. Англіцызмы ў тэрміналогіі сучаснай беларускай літаратурнай мовы: манаграфія / Л. Я. Кавалёва; навук. рэд. праф. П. У. Сцяцко; — Гродна: ГрДУ, 2007. — 186 с.

12. Рамза, Т. Р. Беларускае гутарковае маўленне: сучасны стан / Т. Р. Рамза. – Мінск: Выш. шк., 2011. – 221 с. = электрон. Опт. Дыск: гук.

13. Шкраба, І. Р. Варыянтнасць у сучаснай беларускай мове: структурна-граматычны і функцыянальна-дынамічны аспекты / І. Р.Шкраба. — Мінск: ТАА “Асар”, 2.

К. Н. Козаченко, студентка 1 курса, факультета ИДиП
(БГТУ, г. Минск)

## ИЗДАТЕЛЬСКИЕ ПРОЕКТЫ ЛЕЛЬЧИЦКОЙ РАЙОННОЙ ГИМНАЗИИ

**Введение.** 1 сентября 2010 г. для учащихся города и района открыла двери Лельчицкая районная гимназия. Миссия